КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 6 (1653) | 9 лютага 2024 г.

Беларускаму дзяржаўнаму цырку — 65!

У знак павагі да ўкладу беларускага народа ў Перамогу першы стацыянарны цырк СССР было вырашана пабудаваць у Мінску. А 11 лютага 1959 года ў новай установе прайшоў прэм'ерны паказ. Праграма "Беларускі цыркавы калектыў" распачала летапіс айчыннага брэнда.

Працяг тэмы — на стар. 10

KULTURA-INFO.BY

Фота Ульяны КАСЦЮНІНАЙ

Для ўвекавечання подзвігу

Фота: president.gov.by

Яшчэ дзевяць населеных пунктаў Беларусі ўганараваны вымпелам “За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны”. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў адпаведны дакумент.

Згодна з указам № 44 ад 2 лютага 2024 года, вымпела ўдастоены гарады Асіповічы, Баранавічы, Дзяржынск, Дзятлава, Калінкавічы, Любань, Чавусы, гарадскія пасёлкі Асвея і Обаль. Усе яны — годны прыклад бавявога і працоўнага подзвігу, усенароднага супраціўлення ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

Гэтыя населеныя пункты адзначаны ў сувязі са святкаваннем 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Узнагароджанне праводзіцца ў мэтах увекавечання подзвігу воінаў Чырвонай арміі, рабочых, партызан і падпольшчыкаў, здзейсненага пры абароне і вызваленні беларускіх гарадоў і вёсак.

Вымпел “За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны” быў заверджаны ў 2004-м указам Прэзідэнта да 60-годдзя вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да 2024-га ў краіне такі ганаровы знак мелі 27 населеных пунктаў. Зараз у пачэсны спіс дададзена дзевяць. Кожнае з гэтых месцаў — сапраўдная цытадэль мужнасці, у якой неверагодную адвагу праявілі не толькі байцы, але і мясцовыя жыхары.

Падрабязнасці — на сайце president.gov.by

Напярэдадні важных падзей

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 6 лютага. Дзякуючы відэасувязі, у пасяджэнні паўдзельнічалі і начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Абмяркоўвалася арганізацыя навучальных семінараў, запланаваных у сакавіку на базе санаторна-курортных устаноў, для кіраўнікоў нашай галіны, а таксама правядзенне “Культурнай лыжні”. Яе зладзяць 10 лютага ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімніх відах спорту “Раўбічы”. Пройдуць біятлонная і лыжная эстафеты.

На нарадзе гаварылі і пра ўмовы работы прадстаўнікоў сферы культуры на ўчастках падчас выбарчай кампаніі, планаванне мерапрыемстваў у сёлетняй культурнай сталіцы Беларусі — Бялынічах. Урачыстае адкрыццё акцыі арганізуюць 29 лютага. Таксама ў горадзе пачнецца выстава да 110-годдзя з дня нараджэння П. В. Масленікава.

Акрамя таго, на пасяджэнні разглядаліся пытанні падпіскі на газету “Культура” і часопіс “Мастацтва”.

У належным тэмпе

Міністр культуры Анатолій Маркевіч наведаў будаўнічыя аб'екты Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава і азнаёміўся з ходам работ.

Як паведамілі кіраўніку ведамства, падрадчыкі сумленна выконваюць абавязацельствы, а ўсе працэсы на аб'ектах ідуць у належным тэмпе. Акрамя таго, паспяхова асвойваюцца выдаткаваныя на будаўніцтва сродкі. На дадзены момант пракладзены ўсе камунікацыі. Адмысловцы прыступілі да ўнутранай апрацоўкі памяшканняў. Адметна, што ў аздобе інтэр'ераў выкарыстоўваюцца матэрыялы айчыннай вытворчасці.

Каледж імя Глебава зойме некалькі аб'яднаных будынкаў на вуліцы Багдана Хмяльніцкага. У вучэбнай частцы прадугледжаны класы і майстэрні, актавая і спартыўная залы, кабінеты адміністрацыі, прасторны буфет. У інтэрнаце зроблены пакоі блочнага тыпу з санвузламі, а на кожным паверсе навучэнцам будуць даступныя кухні і памяшканні для самападрыхтоўкі. Мяркуецца, што новы навучальны год выхаванцы і педагогі сустрэнуць ужо ў гэтых утульных сучасных пабудовах.

Захаваць гістарычную памяць

Будынак Музея славы. Праект

Мірнае неба над галавой, права жыць і працаваць у свабоднай дзяржаве здабыта папярэднімі пакаленнямі. Аддаць даніну памяці герояў, зберагчы дасягнутае і ўнесці ўклад у развіццё краіны — святы абавязак патомкаў.

На тэрыторыі Буйніцкага поля, дзе ў ліпені 1941 года абаронцы Магілёва зрабілі немагчымае — 23 дні стрымлівалі армады фашыстаў, узводзіцца Музей славы. Будынак будзе мець выгляд ордэна Айчыннай вайны.

Экспазіцыя музея адлюструе абарончыя і вызваленчыя баі на Магілёўшчыне, палітыку генацыду ў перыяд акупацыі, падпольную і партызанскую барацьбу, пошукавы рух. Цэнтральнай тэмай стане гераічная абарона Магілёва. Увага будзе нададзена і працоўнаму подзвігу — пасляваеннаму аднаўленню Магілёўшчыны, дасягненням у эканоміцы і сацыяльнай сферы. Сучасныя тэхналогіі дазволяць ярка і маштабна апісаць падзеі і герояў, паглыбіўшы наведвальнікаў у атмасферу мінулага.

Музей стане цэнтрам грамадзянска-патрыятычнага выхавання, месцам правядзення мерапрыемстваў па захаванні гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне.

Перыяд агітацыі

Да адзінага дня галасавання засталося ўсяго два тыдні. У краіне ідзе самы актыўны этап электаральнай кампаніі — агітацыя.

Кандыдаты ў дэпутаты знаёмяць выбаршчыкаў са сваімі праграмамі. Заканадаўствам дазволена правядзенне сходаў, пікетаў, сустрэч у месцах, вызначаных выканкамамі, а таксама выраб друкаваных агітацыйных матэрыялаў.

З 5 па 13 лютага выступленні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў можна паглядзець па тэлебачанні — графік размешчаны на сайце Цэнтральнай выбарчай камісіі. Пляцоўку для запісу забяспечыла Белтэлерадыёкампанія: здымкі ладзяцца ў сталічнай студыі на Макаёнка, а таксама ў рэгіянальных філіялах. Перадвыбарную праграму кандыдатам неабходна ўкласці ў пяць хвілін. Галоўны прынцып — аднолькавыя ўмовы для ўсіх удзельнікаў электаральнай кампаніі. Для больш поўнага ахопу аўдыторыі кожнае выступленне ў эфіры суправаджаецца сурдаперакладам.

З цікавасцю за палітычным працэсам сочаць і маладыя людзі Беларусі, асабліва тыя, хто ўпершыню адправіцца на выбарчыя ўчасткі. Напярэдадні важнай падзеі ў Мінску прайшоў моладзевы форум. Падчас дыялогу закраналіся асноўныя пытанні выбарчага права, абмяркоўваліся новаўвядзенні сёлетняй электаральнай кампаніі, акрэслівалася роля Парламента і мясцовых Саветаў дэпутатаў у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі.

Як адзначылі маладыя ўдзельнікі сустрэчы, выбарчая кампанія — гэта не толькі права, але і магчымасць паўплываць на сваю будучыню і будучыню краіны.

Выбары ў люстэрку права

Выстава пад такой назвай працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Экспазіцыя, якая адкрылася 5 лютага ў галоўнай кніжнай скарбніцы краіны, прымеркавана да адзінага дня галасавання: 25 лютага будуць выбраны 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 8-га склікання і 12 514 дэпутатаў мясцовых Саветаў 29-га склікання.

На выставе ў Нацыянальнай бібліятэцы прадстаўлена каля 70 дакументаў на беларускай і рускай мовах. Гэта нарматыўна-прававыя акты, каментарыі, манаграфіі, зборнікі артыкулаў і тэзісаў, матэрыялы дакладаў і навукова-практычных канферэнцый, аналітычных агляды, семінараў і круглых сталоў.

Экспазіцыя ўключае чатыры раздзелы — “Канстытуцыя як аснова выбарчага права Рэспублікі Беларусь”, “Выбары: прававыя асновы і выбарчыя тэхналогіі”, “Выбарчы працэс Беларусі: этапы развіцця і сучаснасць”, “Парушэнні нормаў выбарчага права: адказнасць і прававая абарона”.

Азнаёміцца з тэматычнымі матэрыяламі можна да 1 сакавіка.

За намі праўда

Што вы будзеце рабіць 25 лютага і чаму варта пайсці на выбары? На пытанні адказвае Валерый Шмат, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, лідар арт-групы “Беларусы”:

— Сёлета арт-групе “Беларусы” спаўняецца 20 гадоў. І для нас ужо стала добрай традыцыяй выступаць на ўчастках падчас выбараў.

У 2020-м, калі вызначаўся Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, мы далі канцэрты ў пяці пунктах. Вось і 25 лютага плануем і спяваць, і галасаваць. Важна выбраць годнага кандыдата. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і мясцовых Саветаў — тыя дзеячы ўлады, да якіх мы можам звярнуцца па дапамогу. Я ведаю многа гісторый, калі менавіта такія асобы здолелі вырашыць пытанні гарадскіх і вясковых жыхароў.

Я, калі буду галасаваць, звярну ўвагу на сямейнае становішча. Падаецца, годны бацька ці маці заўсёды паклапоціцца аб навакольных, будзе стараццa палепшыць іх жыццё і паступаць сумленна. Вядома ж, падмуркам для высокіх прафесійных якасцей служаць асабістыя характарыстыкі. Таму ўнутраны свет кандыдата таксама мае вялікае значэнне.

Падчас выступленняў на выбарчых участках арт-група “Беларусы” імкнецца падтрымаць патрыятычны дух насельніцтва. У нашай праграме заўсёды ёсць такія кампазіцыі, як “За намі праўда”, “Кожнаму дому шчасце”, “Трэба трымацца разам” і іншыя жыццесцвярджальныя песні, якія ўсяляюць гонар за краіну. Да сустрэчы 25 лютага, у адзіны дзень галасавання!

Падчас “Культурнай лыжні — 2023”

Культурная лыжня

Актыўныя выхадныя чакаюць работнікаў нашай сферы. Традыцыйныя зімовыя спаборніцтвы “Культурная лыжня” разгорнуцца 10 лютага пад Мінскам.

Рэспубліканскую спартакіяду работнікаў культуры зладзяць у комплексе “Раўбічы”. Цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту збярэ аматараў здаровага ладу жыцця.

У 10 гадзін удзельнікі “Лыжні” пройдуць камісію па допуску да спаборніцтваў — як на сапраўдным чэмпіянаце. Затым адбудзецца пастраенне камандаў. На 11.00 запланавана цырымонія адкрыцця спартакіяды. З прывітальным словам да рупліўцаў галіны звернецца міністр культуры. Дарэчы, Анатолій Маркевіч — заўзяты спартсмен — таксама далучыцца да барацьбы.

Біятлонная эстафета пачнецца ў 11.30. Лыжная гонка “Дружная сям'я” разгорнецца а 13-й гадзіне. У праграме таксама камандныя спаборніцтвы і цырымонія ўзнагароджання. Хто ўзыдзе на першую прыступку п'едэстала і які плён прынясе спартакіяда ўдзельнікам — раскажам у наступным нумары.

Ёсць сінопсіс? Ёсць прапанова!

Марыце пра чырвоную дарожку і мільярдныя касавыя зборы? Шлях у вялікае кіно адкрыты!

Міністэрства культуры і Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм” з 5 студзеня па 20 ліпеня праводзяць конкурс сцэнарыяў для здымак фільмаў і тэлесерыялаў у 2025 годзе з дзяржаўнай падтрымкай.

Патрабуецца якасная сучасная кінадраматургія:

- поўнаметражны фільм у ігравой форме (гераізм супрацоўнікаў праваахоўных органаў падчас падзей жніўня 2020 года ў Беларусі; ваенна-патрыятычная тэма; школа і настаўнікі рэспублікі; працаўнікі беларускай вёскі; айчынныя лётчыкі-героі; героі беларускага спорту; кінаказка з беларускімі героямі для сямейнага прагляду; навагодняя гісторыя для сямейнага прагляду, падзеі якой адбываюцца ў нашай краіне),
- поўнаметражны фільм-падарожжа па сучаснай Беларусі ў неігравой форме,
- тэлевізійныя серыялы (пра айчынную міліцыю; пра шматдзетную сям'ю; пра падлеткаў і (або) моладзь),
- поўнаметражны фільм у анімацыйнай форме (пра прыгоды вядомых казачных герояў ці персанажаў дзіцячай літаратуры).

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца творцы, якія пішуць сцэнары і (або) ставяць фільмы. Прафесійная адукацыя і вопыт вітаюцца, але галоўнае — талент і крэатыў!

Ахвотным паспрабаваць сілы варта паспяшацца: заяўку, сінопсіс і кароткую біяграфію трэба даслаць у Міністэрства культуры да 1 сакавіка. Савет па развіцці кінематаграфіі плануе разгледзець работы да 20 сакавіка. Аўтарам найлепшых сінопсісаў, што трапяць у другі тур конкурсу, будзе прапанавана да 1 ліпеня напісаць сцэнарый для фільма.

По выніках другога этапу савет вызначыць 10 фіналістаў. Пераможцаў чакае прэмія памерам 50 базавых велічынь (2000 рублёў), магчымасць убачыць сцэнарый увасобленым у кінастужцы ўжо ў 2025 годзе, ганарар ад “Беларусьфільма”... А галоўнае — вядомасць і прызнанне.

Падрабязней пра конкурс сцэнарыяў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч і дырэктар РВУ "Культура і мастацтва" Наталля Кузняцова падчас відэаканферэнцыі

Анатолій Маркевіч: “Надышоў час заявіць пра сябе”

Відэаканферэнцыя “Культура – знак якасці менталітэту нацыі”, якую зладзілі ў прэс-клубе Рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і мастацтва”, прыцягнула ўвагу адмыслоўцаў з усіх куткоў краіны. У размове аб актуальных задачах, ролі сферы ў развіцці асобы і дзяржавы прыняў удзел міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч. Магістральнай тэмай стала прыняцце Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024–2026 гады.

Перадусім гаворка ішла аб сучасным свеце — зменлівым і вірлівым. У ім асабліва востра стаіць пагроза ўкаранення наносных каштоўнасцей. Гэта патрабуе больш руплівай працы над фарміраваннем патрыятызму, яднанне вакол нашых спрадвечных нацыянальных традыцый.

— Асобныя дзяржавы граюць мускуламі і вядуць баі без правіл, думаючы, што гегемонія захаваецца надоўга. Але свет стаў іншым, ён перастаў быць аднапалярным. Не ўсім гэта падабаецца.

Наша Беларусь заўсёды займала зразумелую пазіцыю: мы не прэтэндуем на чужыя тэрыторыі і вядзём міралюбную палітыку. Але знешнія контуры вымушаюць нас прымаць рашэнні, каб адгарадзіць сябе ад пранікнення шкоднага, — адзначае Анатолій Маркевіч. — Раней на пэўным этапе мы, магчыма, не так пільна звярталі ўвагу на наносное, на каштоўнасці, якія нам спрабуюць навязаць. Але ў кожнага свая сцяжына, і тое, што імкнуцца нам унушыць, — гэта не наш шлях. Надышоў час голасна заявіць пра сябе, пра нашы традыцыі.

НЕ АДМАЎЛЯЕМСЯ АД СУСВЕТНЫХ ШЭДЭЎРАЎ

Між тым прыняцце Канцэпцыі не азначае, што беларускае грамадства будзе ізаляваць і адмаўляцца ад агульначалавечых набыткаў. Важна захаваць культурную разнастайнасць і адкрытасць да вынікаў творчай дзейнасці іншых народаў.

— Мы не хочам ставіць перашкоды. Найлепшы перадавы досвед у сферы культуры мы выкарыстоўвалі і будзем выкарыстоўваць. У нашых тэатрах і на канцэртных пляцоўках дэманструюцца шэдэўры з сусветнага здабытку. Вядома, мы павінны браць найлепшае дзеля сябе. Але прыйшла пара распавесці пра нашу Беларусь, нашу вялікую культуру. І мы гэта ўмеем рабіць, — падкрэсліў Анатолій Мечыслававіч.

ПРЫВІЦЬ КАШТОЎНАСЦІ НОВАМУ ПАКАЛЕННЮ

Канцэпцыя развіцця нацыянальнай культурнай прасторы прадугледжвае забеспячэнне пераемнасці і перадачы ад пакалення да пакалення традыцыйных для беларускага грамадства каштоўнасцей. Ва ўмовах глабалізацыі асабліва актуальнай сталася праца з моладдзю.

— Моладзь як губка ўбірае ўсё. Варта не дапусціць пранікнення таго, што разбэшчвае падрастаючае пакаленне. Таму вельмі важна нам самім разабрацца ва ўсіх перыпетыях і прапанаваць наўзамен цікавыя праекты, зрабіць так, каб штодзённае жыццё было культурным і карысным. Неабходна прапаноўваць тое, што выхавае любоў да радзімы, да родных і блізкіх, павагу да традыцый, — упэўнены кіраўнік ведамства.

ЗА ТВОРЦАМІ – ВЯЛІЗНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Анатолій Маркевіч падкрэслівае важкасць місіі па фарміраванні светапогляду грамадзян, ускладзенай на супрацоўнікаў сферы культуры, творчых работнікаў. Менавіта прадстаўнікі нашай галіны робяць неацэнны ўклад у збяражэнне самабытнасці і самастойнасці Беларусі.

— Сфера культуры адна з першых мусіць даносіць людзям важныя стваральныя пасылы, выпрацоўваць светапогляд, кансалідаваць грамадства і заяўляць пра нас у сусветнай прасторы. Вядома, падвесці ўсіх да адной роўніцы немагчыма, напэўна, і не трэба. У кожнага ўласны светапогляд. Але ўся сэнсавая нагрузка нашай дзейнасці мусіць быць нацэленая на стваральную працу, на кансалідацыю грамадства. І ў нас гэта атрымліваецца. Я ўдзячны вялізнай арміі работнікаў культуры. У нас шчыруе больш за 56 тысяч чалавек. Я ганаруся тым, што мне давялося працаваць разам з імі.

У той жа час не трэба толькі цешыцца дасягненнямі, бо казаць аб выканні ўсіх задач немагчыма: жыццё заўсёды ставіць новыя ўмовы і дыктуе новыя патрабаванні. Нам важна не заблытацца, не пахіснуцца, а захоўваць дакладнае бачанне сучаснасці з апорай на гістарычную праўду, якая з'яўляецца падмуркам для развіцця сферы культуры.

АБ'ЯДНАЦЬ НАМАГАННІ

Зрэшты, на абарону нацыянальнай культурнай прасторы, умацаванне традыцыйных каштоўнасцей і фарміраванне патрыятызму мусіць працаваць не толькі наша сфера. Гэта агульная для ўсяго грамадства задача. І рэалізацыя Канцэпцыі прадугледжвае развіццё міжведамаснага і міжгаліновага ўзаемадзеяння, грамадска-дзяржаўнага партнёрства.

— Мы дапаўняем адно аднаго. Культура не можа быць адасобленай ад адукацыі, ад рэальнага сектара эканомікі, і таму Канцэпцыя развіцця нацыянальнай культурнай прасторы аб'ядноўвае розныя галіны. Калі мы распрацоўвалі дакумент, імкнуліся зрабіць яго практыкаарыентаваным. У ім прапісаны ўсе падыходы па ўзаемадзеянні. Акрамя таго, прыняты план мерапрыемстваў па рэалізацыі Канцэпцыі. У ім канкрэтызавана, што неабходна зрабіць кожнаму з нас.

БАЛАНС ДУШЫ І ТЭХНАЛОГІЙ

Сфера культура перажывае сур'ёзныя трансфармацыі, звязаныя з узмацненнем ролі інфармацыйных тэхналогій. Яны адкрываюць новыя магчымасці для інтэлектуальнага і культурнага развіцця і ў той жа час ставяць перад спецыялістамі новыя задачы.

— Вядома, мы не можам застацца на ўзбочыне інфармацыйных тэхналогій і новых падыходаў. Але неабходна заўсёды памятаць, што сфера культуры асаблівая. Тэхніка не заменіць душу. Ні ў якім разе не настальгіруем, бо ўсведамляем важную ролю сучасных тэхналогій. Тым больш што наша аўдыторыя — гэта ўсе жыхары краіны, людзі рознага ўзросту.

І ўсё ж традыцыйныя формы, жывыя эмоцыі не адмяніць. Вельмі радасна бачыць шмат прадстаўнікоў маладога пакалення ў нашых канцэртных і тэатральных залах, прыкмячаць захапленне на іх тварах. Мяркую, сумяшчэнне новых падыходаў і традыцый будзе прыцягваць гледачоў.

РЭГІЁНЫ ЯК ТВОРЧАЯ СКАРБНІЦА

Сучаснае культурнае жыццё Беларусі дынамічнае і разнастайнае. У розных кутках краіны па сёння жывуць самабытныя традыцыі, зберагаюцца аб'екты спадчыны, плённа працуюць музеі, бібліятэкі ды іншыя ўстановы. На мясцовым унікальным матэрыяле ладзіцца мноства адметных фэстаў. І актуальнай задачай з'яўляецца актывізацыя культурнага патэнцыялу рэгіёнаў.

— Мы бачым, наколькі самабытная культура нашых рэгіёнаў, якую аўтэнтычную спадчыну яны захоўваюць. Выклікаюць гонар здабыткі розных куткоў краіны. Заўважце, якая сур'ёзная падтрымка аказваецца, як шмат увагі надаецца матэрыяльна-тэхнічнай базе, аснашэнню ўстаноў культуры. Мясцовыя ўлады разумеюць важнасць сферы: мова мастацтва — галоўны сродак для таго, каб дагрукацца да душы і свядомасці чалавека.

Рэспубліканскі фестываль "Беларусь — мая песня" (2 лютага — 3 ліпеня): гала-канцэрты абласцей і Мінска ў Палацы Рэспублікі

Сёлета мы адрадзілі цудоўную традыцыю фестывалю “Беларусь — мая песня”, калі кожны рэгіён ладзіць справаздачны канцэрт у сталіцы, прэзентуе найлепшыя свае творчыя сілы. Усе напрамкі, якімі ганарацца прадстаўнікі абласцей і раёнаў, будуць прадстаўлены на сцэне Палаца Рэспублікі. Упэўнены: кожны глядач атрымае сапраўднае задавальненне.

ПАД ЗНАКАМ СВЯТОЙ ДАТЫ

Сёлета Беларусь адзначыць знакавую дату — 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта сапраўды святая гістарычная падзея, якая прынесла на нашу зямлю мір і свабоду, заклала падмурак для далейшага росквіту. Натуральна, што пад знакам гэтай гадавіны пройдзе мноства маштабных творчых праектаў, агульнарэспубліканскіх і лакальных падзей.

— Марафон падзей да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ужо пачаўся. Бягучы год будзе насычаны мерапрыемствамі, якія падкрэсліваюць значнасць гэтай даты. Мы павінны выказаць словы вялікай падзякі ветэранам, пакланіцца тым, хто здабываў Вялікую Перамогу. Дзеля яе прынесена ў ахвяру вялізная колькасць жыццяў. І кожны разумее, што толькі дзякуючы савецкаму салдату сёння мы жывём спакойна, упэўнена глядзім у будучыню.

Падчас падрыхтоўкі мерапрыемстваў мы задзейнічаем найлепшыя творчыя сілы, што прэзентуюць цікавыя праграмы як у сталіцы, так і ў кожным рэгіёне.

Будуць створаны канцэрты, якія зацікавяць мноства гледачоў. Рыхтуецца і сумесны праект з расійскімі калегамі. Напярэдадні вялікай даты 3 ліпеня адбудзецца гала-канцэрт фестывалю “Беларусь — мая песня” з нумарамі ад розных рэгіёнаў. Адбудзецца традыцыйнае ўшанаванне работнікаў сферы культуры з удзелам Прэзідэнта.

Плануюцца імпрэзы ў нечаканых месцах: на вакзалах, у гандлёвых цэнтрах. Там артысты выканаюць песні, што натхнялі і вялі ў бой нашых салдат. Шмат часу будзе прысвечана пленэрам, а найлепшыя работы па іх выніках пакажам у Нацыянальным мастацкім музеі.

Праграма сапраўды будзе насычанай. І яна адлюструе, праз якія выпрабаванні прайшоў наш народ, наколькі значная Перамога і якая гэта каштоўнасць — жыць у мірнай краіне.

Алесь ДАНІЛОВІЧ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Цытаты ў нататнік

- "Сфера культуры адна з першых мусіць даносіць людзям важныя стваральныя пасылы, выпрацоўваць светапогляд, кансалідаваць грамадства і заяўляць пра нас у сусветнай прасторы".
- "Мова мастацтва — галоўны сродак для таго, каб дагрукацца да душы і свядомасці чалавека".
- "Мы ганарымся нашымі культурнымі дасягненнямі".
- "Сёння такі час, калі мы павінны заявіць пра сябе, пра свае традыцыі, культуру, спадчыну".

(Працяг. Пачатак у “К” № 4 ад 26.01.2024 г.)

Стары замак у Гродне

Нясвіжскі замак

Сто гадоў на варце спадчыны

Як развівалася сістэма аховы помнікаў у Беларусі?

Летась споўнілася 30 гадоў з даты стварэння Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, але агулам гісторыя фарміравання сістэмы дзяржаўнага ўліку і аховы аб’ектаў нацыянальнай спадчыны Беларусі ахоплівае ўжо больш як векавы перыяд. У папярэдніх нумарах мы прыгадалі этапы развіцця гэтай сферы ў 1920–1990-х. Аб наступных вехах станаўлення сістэмы аховы помнікаў у Беларусі распавядае Генадзій Ходар, кансультант упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

УПАРАДКАВАННЕ ЎЛІКУ

Зацягнуты перыяд прававога пераносу помнікаў гісторыі і культуры са спісаў БССР у Дзяржаўны спіс, а таксама адсутнасць зацверджанага або апублікаванага спіса ў якасці юрыдычнага дакумента стварыла ў пачатку 2000-х напружаную сітуацыю з Дзяржаўным падатковым камітэтам вакол вызвалення ад падаткаабкладання работ па рэканструкцыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, унесеных у Дзяржаўны спіс і вышэйназваныя спісы БССР.

У мэтах упарадкавання дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей была прынятая пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1383 ад 19 верасня 2001 года, якая даручала Міністэрству культуры распрацаваць і зацвердзіць парадак вядзення і публікацыі Дзяржаўнага спіса. Таксама гэтай пастановай былі адмененыя спісы аб’ектаў, выдадзеныя ў сямітомным зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларускай ССР.

Развіццём пытання стала падрыхтоўка і прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь № 134-З ад 24 ліпеня 2002 года “Аб унясенні змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у сувязі з рэарганізацыяй сістэмы рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання”, паводле якога органам, упаўнаважаным на наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, зрабілася Міністэрства культуры. Такім чынам, з 1 верасня 2003 года Дзяржаўны спіс зрабіўся адзіным дакументам дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей.

КІРУНАК ДА АДКРЫТАСЦІ

У 2002—2003 гадах адбываецца рэзкае павелічэнне колькасці аб’ектаў, уключаных у Дзяржаўны спіс: у 2002-м іх налічвалася 2793, а ў 2003-м — ужо 4326. Гэтае пашырэнне спіса адбывалася на падставе аўтаматычнага пераносу аб’ектаў спадчыны са спісаў БССР па прапанове мясцовых органаў улады ў адпаведнасці з рашэннямі Рады №№ 70-92. Разам з тым прапановы па пераносе ў Дзяржаўны спіс з ліку аб’ектаў, якія страцілі ахоўны статус, былі вельмі выбарачнымі. У мэтах аб’ектыўнай ацэнкі гэтых працэсаў можна адзначыць, што з ліку помнікаў гісторыі і культуры, у першую чаргу воінскіх пахаванняў, у Дзяржаўны спіс уключана толькі 930 аб’ектаў. У цэлым улік гэтай катэгорыі аб’ектаў культурнай спадчыны атрымаў развіццё па лініі Міністэрства абароны ў створаным у 2001 годзе рэгістры воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войнаў Рэспублікі Беларусь, які сёння налічвае болей за восем тысяч месцаў пахаванняў.

12 верасня 2002 года Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей быў зарэгістраваны ў Дзяржаўным рэгістры інфармацыйных рэсурсаў. Далейшым развіццём сістэмы ўліку стала прыняцце па ўзгадненні з аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 11 ад 10 красавіка 2003 года “Аб зацвярджэнні Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь”. Публікацыя гэтай пастановы зрабілася значным крокам у плане публічнасці і адкрытасці гэтага дакумента. Пунктам 2 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 303 ад 17 сакавіка 2004 года Дэпартамент па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры быў скасаваны. Замест яго ў структуры міністэрства было створана ўпраўленне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі.

ПАШЫРЭННЕ СПІСА

У 2006 годзе быў прыняты новы Закон “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі”, нормы якога замацавалі паўнамоцтвы па наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці за ўрадам Рэспублікі Беларусь. У развіццё гэтага закона ў 2006-м на ўзроўні Савета Міністраў было зацверджанае Палажэнне аб вядзенні Дзяржаўнага спіса, якое замацавала яго сучасныя выгляд і структуру. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 578 ад 14 мая 2007 года “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей” фактычна быў перазацверджаны існуючы Дзяржаўны спіс.

З аднаго боку, прызнанне яго актам найвышэйшай юрыдычнай сілы садзейнічала ўзмацненню прававога статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, а прынятае Палажэнне аб вядзенні Дзяржаўнага спіса сістэматызавала далейшую працу па яго пашырэнні (з 2006 па 2016 год ён вырас з 4585 да 5525 аб’ектаў). Разам з тым ні закон 2006 года, ні пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 578 ад 14 мая 2007 года не прадугледжвалі пераходных палажэнняў для аб’ектаў, якія ўжо знаходзіліся пад аховай дзяржавы і нават былі надзеленыя статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці ў 2002—2003 гадах, што выклікае і сёння блытаніну сярод спецыялістаў і ўласнікаў у вызначэнні фактычнай даты надання статусу гэтым аб’ектам.

Толькі ў пашпарце гісторыка-культурнай каштоўнасці, які з’яўляецца галоўным уліковым дакументам, у гістарычнай даведцы могуць быць апісаныя ўсе пераходныя моманты знаходжання такіх аб’ектаў у ахоўных спісах.

З 2006 па 2016 год было прынята дзевяць пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якія фарміравалі і пашыралі Дзяржаўны спіс, аднак значным недахопам была адсутнасць яго ў адкрытым доступе. Сярод істотных змен закона ў 2012 годзе неабходна адзначыць удасканаленне паняційнага апарату і ўкараненне міжнародных нормаў UNESCO, у тым ліку Канвенцыі аб ахове сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 года. Гэтыя змены дазволілі павялічыць прысутнасць у Дзяржаўным спісе нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (з 76 элементаў у 2012 годзе да 178 у 2023-м).

У АДПАВЕДНАСЦІ З КОДЭКСАМ

У 2016 годзе быў падпісаны Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, які зрабіўся першым распрацаваным і прынятым на постсавецкай прасторы кадыфікаваным актам у гэтай сферы. Ён перафарматаваў работу па вядзенні Дзяржаўнага спіса. У першую чаргу паўнамоцтвы па яго фарміраванні былі зноў перададзены ад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Міністэрству культуры. Таксама Кодэкс прадаставіў паўнамоцтвы па наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыі “3” мясцовым выканаўчым і распарадчым органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню. Пры кожным аблвыканкаме і Мінскім гарвыканкаме былі створаныя саветы па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, упаўнаважаныя разглядаць прапановы аб наданні статусу і прымаць рашэнні аб значнасці культурнай каштоўнасці для рэгіёна.

У адрозненне ад Закона Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” 2006 года, Кодэкс прадугледзеў пераходныя палажэнні ў частцы захавання юрыдычнай сілы вышэйзгаданых дзеяўці пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. На ўзроўні заканадаўчага акта ўпершыню ў гісторыі Беларусі былі замацаваныя парадак выяўлення і вылучэння новых аб’ектаў спадчыны, патрабаванні да зместу прапаноў аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і рэгламент іх разгляду ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі.

Артыкуламі Кодэкса 93 і 94 вызначалася, што рашэнне аб наданні або пазбаўленні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці з’яўляецца нарматыўным прававым актам і падлягае давядзенню да ведама зацікаўленых шляхам размяшчэння на афіцыйным сайце Міністэрства культуры. Дзякуючы гэтаму новаўвядзенню з 2017 года сам Дзяржаўны спіс і рашэнні па ім пачалі публікавацца ў раздзеле “Спадчына” сайта Міністэрства культуры, а з 2020-га ён прадстаўлены ў выглядзе дзяржаўнага інфармацыйнага рэсурсу — пошукавага сайта “Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі” па адрасе gosspisok.gov.by.

АГУЛЬНЫМІ НАМАГАННЯМІ

З 2019 года Міністэрствам культуры сумесна з мясцовымі органамі праводзіцца актыўная работа па актуалізацыі звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях. За гэты перыяд у Дзяржаўным спісе актуалізавана звыш 2700 пазіцый, у тым ліку ў частцы ўдакладнення назваў, складу, даціроўкі, катэгорыі і адрасацыі аб’ектаў спадчыны. Разам з тым практыка паказала, што перададзеныя з 2017-га выканаўчым камітэтам паўнамоцтвы па разглядзе прапаноў аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці выкарыстоўваліся малаэфектыўна ў сувязі з нізкай зацікаўленасцю мясцовых органаў у пашырэнні Дзяржаўнага спіса.

З 2017 па 2022 год мясцовымі выканаўчымі і распарадчым органамі абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню прынята 18, а Міністэрствам культуры — 42 рашэнні адносна фарміравання спіса. У сувязі з гэтым пры карэкціроўцы Кодэкса ў 2022-м былі змененыя падыходы да вядзення Дзяржаўнага спіса. З 1 студзеня 2023 года паўнамоцтвы па наданні або пазбаўленні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і вызначэнні яе катэгорый замацаваныя за адзіным дзяржаўным органам — Міністэрствам культуры.

АПОШНІЯ НОВАЎВЯДЗЕННІ

Істотным змяненнем парадку разгляду прапаноў аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці з’яўляецца тое, што, незалежна ад рашэння абласных або мінскай гарадской саветаў па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, кожная прапанова павінна быць пададзеная ў Міністэрства культуры для прыняцця канчатковага рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. Форма ўнясення такой прапановы для нематэрыяльных праяў творчасці чалавека асобна ўстаноўленая пастановай Міністэрства культуры № 110 ад 30 лістапада 2022 г. Унесеныя змяненні ў артыкулы 97 і 98 Кодэкса, якія далі магчымасць упарадкаваць структуру Дзяржаўнага спіса і парадак яго вядзення, у тым ліку ў частцы актуалізацыі фактычных звестак.

У мэтах арганізацыі вядзення спіса гэты дакумент зацверджаны пастановай Міністэрства культуры № 1 ад 3 студзеня 2023 года. Такое рашэнне, разам з функцыянаваннем Дзяржаўнага спіса ў якасці інфармацыйнага рэсурсу, забяспечвае найбольш даступнае і празрыстае яго развіццё ў якасці галоўнага дакумента дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі. Мэтавым паказчыкам Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2021—2025 гады прадугледжана ўключэнне ў Дзяржаўны спіс не менш як трох новых элементаў штогод. Пунктам 10 рашэння калегіі Міністэрства культуры № 109 ад 21 чэрвеня 2023 г. аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму рэкамендавана штогод выяўляць не менш як два новыя матэрыяльныя аб’екты для ўключэння ў Дзяржаўны спіс.

Развіццё заканадаўства БССР і Рэспублікі Беларусь прайшло няпросты эвалюцыйны шлях ад спроб абагульнення ўліку культурнай спадчыны да вылучэння асобных форм аб’ектаў, якія ахоўваюцца дзяржавай, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях. Пачынаючы з 1926 года фармаваліся і вялася першыя пералікі аб’ектаў спадчыны, якія падлягалі ахове дзяржавай. Ахоўныя спісы некалькі разоў страчвалі сілу ў сувязі са зменамі заканадаўства. Разам з тым заўсёды захоўвалася пераемнасць у вызначэнні асаблівага прававога статусу такіх аб’ектаў спадчыны. Асноўная частка аб’ектаў Дзяржаўнага спіса (больш за 80 %) была выяўленая і ўзятая на ўлік у савецкі перыяд беларускай дзяржаўнасці. Прынятыя сёння прававыя меры дазваляюць арганізоўваць неабходныя мерапрыемствы па пашырэнні Дзяржаўнага спіса і яго стабільным вядзенні.

Антон РУДАК
Фота аўтара і з архіваў

Мірскі замак

Лідскі замак

Палац у Косаве

Абрад “Стрэчаньскія Дзяды” пройдзе 10 лютага ў Музеі народнай архітэктуры і побыту.

Выстава “Мова ваеннай ілюстрацыі” адкрытая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Афіша фільма, 1958 год

Няспынны бег “Гадзінніка”

Да двух вялікіх юбілеяў — 100-годдзя нацыянальнага кіно і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — у студзені мы распачалі праект “Векапомнае праз кінакадр”. Падрыхтаваны сумесна з Музеем гісторыі беларускага кіно — філіялам Нацыянальнага гістарычнага музея — і экспертамі агляд расказвае аб знакавых ваенных стужках “Беларусьфільма”.

Перамога ў Вялікай Айчыннай — подзвіг усяго савецкага народа. Гэта не толькі салдаты, якія самаддана абаранялі Радзіму, але і партызаны, падпольшчыкі, простыя людзі, што ахвяравалі ўсім дзеля агульнай мэты. У пасляваенныя гады на франтавых гісторыях часта грунтаваліся літаратурныя і кінематаграфічныя творы. Сюжэты першых падобных фільмаў (напрыклад, “Канстанцін Заслонаў”, 1949, рэжысёры Уладзімір Корш-Саблін і Аляксандр Файнцымер) былі натхнёны нявыдуманымі падзеямі і асобамі. Але экраннымі героямі станавіліся не толькі адважныя мужчыны. Асаблівую інтанацыю маюць карціны, у якіх подзвіг здзяйсняе жанчына. І сёння мы спынімся якраз на такой стужцы.

ГЕРАІЧНЫ ПРАТАТЫП

Драма “Гадзіннік спыніўся апоўначы” (1958) рэжысёра Мікалая Фігуроўскага — частка залатой калекцыі “Беларусьфільма”. І недарма: карціна ўвайшла ў пяцёрку самых касавых за ўсю гісторыю студыі.

Стужка заснавана на рэальнай падзеі: Алена Мазанік знішчыла кіраўніка рэйхскамісарыята захопленай Беларусі гаўляйтара Вільгельма Кубэ, які праводзіў жорсткую акупацыйную палітыку і забіваў сотні тысяч мірных жыхароў. У 1941-м Алена ўладкавалася на працу да немцаў спачатку прыбральшчыцай у вайсковую часць, затым афіцыянткай у афіцэрскае казіно. У чэрвені 1943 года яе перавялі ў асабняк, дзе Кубэ жыў з сям’ёй. І ўжо праз пару месяцаў, 22 верасня, дзяўчына здолела падкласці міну ў пакой гаўляйтара.

Гісторыя сама па сабе вельмі кінематаграфічная. Таму не дзіўна, што аўтары вырашылі ўвасобіць яе на экране. І хоць сюжэт фільма ў многіх дэталях адрозніваецца ад рэчаіснасці, а рэальныя імёны засталіся паза кадрам, асноўная лінія была захавана і, дзякуючы майстэрскай прапрацоўцы характараў, нават зайграла больш яркімі фарбамі.

БЕЛАРУСЫ НА ЭКРАНЕ

У першы год драму пра подзвіг падпольшчыцы паглядзела каля 35 мільёнаў чалавек. Такая цікавасць да фільма тлумачыцца не толькі тэматыкай. Поспех карціны, на думку крытыка, галоўнага рэдактара часопіса “На экранах” **Людмілы Перагудавай**, быў “практычна гарантаваны ўдзелам выдатных акцёраў, многія з якіх ужо ў той час з’яўляліся гонарам і славай беларускага тэатра і кіно”.

— Прыгажуня Рыта Гладунко, карыфеі нацыянальнай сцэны Дзмітрый Арлоў, Пётр Пекур, Здзіслаў Стома, Леанід Рахленка, Зінаіда Бравярская, Лідзія Ржэцкая. Адзін толькі пералік гэтых зорных імёнаў — сведчанне высокага класа акцёрскайігры. У творчай біяграфіі кожнага з занятых у фільме акцёраў карціна “Гадзіннік спыніўся апоўначы” заняла важнае месца.

Галоўную ролю ў стужцы выканала Маргарыта Гладунко, маладая актрыса Купалаўскага тэатра. Рэжысёру Мікалаю Фігуроўскаму прыйшлося адстойваць яе кандыдатуру на мастацкім савеце, бо мэтр бачыў гераіню адкрытай і ранімай. Аўтар з выбарам не пралічыўся: артыстку палюбіла і публіка, і журы Усесаюзнага кінафестывалю ў Кіеве. На творчым форуме Маргарыце былі прысуджаны дыплом і першая прэмія за найлепшую жаночую ролю.

ЗОЛАТА КАЛЕКЦЫІ

Карціну “Гадзіннік спыніўся апоўначы” можна назваць класікай нацыянальнага кінематографа. У параўнанні з многімі ваеннымі стужкамі гэтая захапляе гледача больш, таму што не проста пераказвае асобную падзею Вялікай Айчыннай. “Гадзіннік” — сапраўдны твор мастацтва, у якім талент аўтараў спалучаецца са сродкамі кінематографа. Гэта не фільм-плакат. Гэта фільм-карціна.

— Значны ўклад у мастацкае аблічча стужкі ўнёс Яўген Ганкін, вучань Сяргея Эйзенштэйна, узнавіўшы (а часам і стварыўшы) у кадры даступнымі сродкамі выразнасці цяжкую атмасферу фашысцкага тэрору і моц народнага супраціўлення, якая ўзрастала, — разважае Людміла Іванаўна. — Сваю “ролю” адыграла і выдатная, глыбока нацыянальная музыка да фільма, у прыватнасці песня Марыны, якую яна выконвае на беларускай мове. Вось як пра кампазіцыю пісалі крытыкі таго часу: “Гэтая песня не проста ўстаўны канцэртны нумар. Яна выступае тут як паўнапраўны, арганічны кампанент драматургіі... Несумненная вартасць фільма, якая заключалася ў праўдзівасці і глыбіні трактоўкі цэнтральных вобразаў, у дакладнасці малюнка рэгіянай барацьбы партызан-падпольшчыкаў, вылучылі драму ў лік найлепшых твораў беларускага кіно, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне”.

Аднак нельга палюбіцца ўсім і адразу. Былі сярод гледачоў і тыя, хто ацаніў карціну Мікалая Фігуроўскага неадназначна. Шмат у чым — праз схаваныя за кадрам наступствы апісанай гісторыі.

— Нягледзячы на відавочныя мастацкія вартасці, крытыкі ўспрынялі прэм’еру неаднадушна, — дадае Людміла Перагудава. — Раздаваліся заўвагі і з боку непасрэдных удзельнікаў падзеі. Аднак публіка захапілася карцінай. Фільму “Гадзіннік спыніўся апоўначы” ўдалося застацца пераканаўчым і без агітацыі. Стрыманы пафас стужкі спалучаўся з высокім эмацыйным напалам, які хутчэй адчуваўся, чым быў увасоблены ў бачнай форме.

ПАПУЛЯРНЫ І СЁННЯ

Ці значная карціна “Гадзіннік спыніўся апоўначы” цяпер? Безумоўна. Ці здольная яна ўтрымаць увагу сучасная гледача? Так. Гэта не стэрэатыпны, як бы сказала маладое пакаленне, “чарговы фільм пра вайну”. Гэта сумленнае кіно, якое грае на тонкіх псіхалагічных паўтонах як у раскрыцці герояў, так і ў прыёмах апісання падзеі.

— Фільм папулярны і сёння. Без перабольшання! Адна з прычын гэтай нячастай у нашым кінематографе з’явы: гісторыя самаадданага подзвігу падпольшчыкаў расказана ў карціне не дакументальна, не пафасна, не “мовай плаката” — яна расказана цікава. Уражальны рэальны сюжэт, што пакладзены ў аснову сцэнарыя, цікавы сам па сабе. Але тое, як падзеі былі ўвасоблены на экране здымачнай групай, таксама заслугоўвае захаплення. Стужка “Гадзіннік спыніўся апоўначы” выклікала да жыцця спробу рымейка — тэлесерыял рэжысёра Алега Базілава “Паляванне на гаўляйтара”, створаны ў 2012 годзе на базе “Беларусьфільма”. Не спыняючыся падрабязна на мастацкіх вартасцях “фарматнага” прадукту, можна ўсё ж адзначыць: гэта адзін з пераканаўчых прыкладаў невычэрпнай цікавасці як да тэмы, раскрытай на экране, так і да самой карціны-першакрыніцы. Тое, што менавіта фільм Мікалая Фігуроўскага стаў пабуджальнай прычынай для новай версіі, бясспрэчна, — упэўнена Людміла Перагудава.

Сёння можна смела сказаць, што ў 1958 годзе калектыў аднадумцаў, аб’яднаных рэжысёрам Мікалаем Фігуроўскім, здзейсніў творчы подзвіг. Перапоўнены глыбокай павагай да тэмы і зняты на высокім прафесійным узроўні фільм не проста быў арыентаваны на шырокую аўдыторыю, а здолеў заваяваць яе. І гэтая стужка з’яўляецца сапраўднай даніной памяці героям, якія не шкадавалі жыцця ў барацьбе з акупантамі.

Яўгенія ГАБЕЦ
Фота з архіва Музея гісторыі беларускага кіно

Кадры з фільма

Мікіта Захарчук у майстэрні

Здзейсніць мару

Вера ў дзіцячую мару прывяла 21-гадовага Мікіту Захарчука да сапраўднай славы. Ураджэнец Пінска тройчы станавіўся прызёрам Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу моды і фота “Млын моды” і неаднаразова ўдастойваўся высокіх узнагарод Міжнароднага конкурсу дызайнераў “Сібірскі куцюр’е”. Акрамя таго, хлопец — аўтар трох калекцый адзення, адна з якіх нарадзілася ў супрацоўніцтве з Аршанскім ільнокамбінатам. За значныя заслугі Мікіта быў уганараваны прэстыжнай стыпендыяй спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Наш новы герой расказаў аб творчым шляху, конкурснай дзейнасці, любімым універсітэце і планах.

КІМ СТАЦЬ?

Для маленькага Мікіты свет моды адкрыўся дзякуючы шоу і дывановым дарожкам, якія “круціліся” па тэлебачанні. Ужо ў шэсць гадоў хлопец дакладна вызначыўся з прафесіяй.

— Памятаю, як настаўніца раздала нам анкеты з пытаннем: “Кім ты марыш стаць?” Я напісаў: “Мадэльерам”. Ужо тады разумеў, што гэта той, хто малюе і стварае адзенне.

Паступленне ў Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт на кафедру дызайну і моды для маладога чалавека было ўсвядомленым. У восьмым класе ён убачыў у рабочым сшытку па англійскай мове артыкул пра выкладчыцу ВДТУ, мадэльера з сусветным імем Людмілу Тараканаву. З тых часоў хлопец разглядаў выключна віцебскую ВНУ. Сталічныя яго ніколі не прыцягвалі:

— Мой універсітэт падарыў мне больш чым проста вышэйшую адукацыю. Дзякуючы яму ўдзельнічаю ў розных праектах рэспубліканскага і міжнароднага маштабу. Тут я не толькі студэнт, але і работнік — ужо чатыры гады. На шчасце, маім настаўнікам стала тая самая Людміла Уладзіміраўна Тараканава-Папкоўская, дацэнт кафедры дызайну і моды. Працуем з ёй у добрым тандэме педагога і вучня. Без Людмілы Уладзіміраўны не было б такой фразы, як “Мікіта Захарчук — малады беларускі дызайнер”.

НАТХНІЛА ЦЫБУЛЯ

Наш герой — трохразовы прызёр Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу моды і фота “Млын моды” ў 2021—2023 гадах. Для маладых дызайнераў гэтае спаборніцтва — першы шанц заявіць пра сябе ў лакальным, беларускім коле моднай індустрыі:

— У 2021-м я прэзентаваў дэбютную калекцыю Sweet look. Гэта адзенне з мінімальнай колькасцю разрэзаў і максімальнай — складак. Блузкі, сукенкі, спадніцы, штаны былі зроблены з тканін, якія захоўваліся ў куфры маёй прабабулі і дасталіся мне ў якасці спадчыны. Крыніцай натхнення паслужыла фіялетавая салодкая цыбуля. Я разглядзеў яе разрэз з прожылкамі і інтэрпрэтаваў іх як складкі. Не марыў пра ўзнагароду, але заняў другое месца — і гэта была неверагодная феерыя эмоцый.

У 2022-м я вярнуўся на конкурс, каб прадэманстраваць свой максімум, хаця аказалася цяжка прыдумаць другую калекцыю. Здавалася, што ў першы раз выклаўся на ўсе 100 %. Але я стварыў калекцыю “Герлы”, і яна стала рэвалюцыяй у кар’еры — мяне многія запомнілі. Журы зноў прысудзіла другое месца. Гэта выдатны вынік.

Летась на “Млыне моды” я перамог у намінацыі “Фота”. Мой праект называўся “Ніткамі часу выткана жыццё”. На здымках былі прадстаўлены мадэлі ў вырабах з калекцыі “Герлы”. Гэта гісторыя пра дзяўчат-супергераінь, якія дапамагаюць маленькаму шасцігадоваму Мікіту здзейсніць яго запаветнае жаданне. Спадзяюся, людзі зразумелі, што не варта смяяцца са сваёй дзіцячай мары і баяцца яе. Рэалізаваць — самае разумнае рашэнне.

САПРАЎДНЫ ПРЫГАЖУНЧЫК

Мікіта Захарчук прызнаны на роднай зямлі і вядомы ў Расіі. Наш герой — трохразовы пераможца Міжнароднага конкурсу дызайнераў “Сібірскі куцюр’е”. У ліпені 2023-га творцу ўзнагародзілі ганаровым знакам “Сярэбраны фенікс”, а ў кастрычніку — “Сярэбраным манекенам”:

— У 2021-м я стаў першым беларусам, які за 26 гадоў існавання конкурсу атрымаў прыз “Сярэбраны гузік”. Поспех прынесла калекцыя Sweet look. У наступным годзе ў Новасібірску я прадставіў “Герлы” і заняў першае месца, забраўшы гузік з брыльянтам. У 2023-м прывёз на конкурс калекцыю “Прыгажунчыкі”, выкананую ў супрацоўніцтве з Аршанскім ільнокамбінатам. Яна прысвечана сталенню хлопчыкаў. Усім вядома, што дзяўчынкі вырастаюць раней, і я ўзняў такое пытанне: чаму ў гардэробе маладога чалавека ад 18 да 24 гадоў мала яркіх фарбаў? У якасці матэрыялу ўжыў лён. Яго прывыклі выкарыстоўваць для пашыву кашуль, блузак, сукенак на лета, а я прадставіў дэмісезоннае адзенне. Тады мне ўручылі ганаровы знак за развіццё дызайну “Сярэбраны манекен”. Звычайна такую ўзнагароду атрымліваюць удзельнікі намінацыі “Профі”, у якой змагаюцца члены Саюза дызайнераў, уладальнікі вялікіх брэндаў. Для мяне было пачэсна на пятым курсе ўдастоіцца высокай ацэнкі вялікіх прафесіяналаў. З’явілася жаданне захоўваць аўтарытэт і паказваць яшчэ лепшыя вынікі.

КАРЫСНАЯ МОДА

Малады дызайнер не толькі ўдзельнічае ў конкурсах, але і актыўна падтрымлівае праекты, якія праводзіць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. У мінулым годзе калекцыя Мікіты “Прыгажунчыкі” дэманстравалася падчас мужчынскага дэфіле на “Міс і містар студэнцтва — 2023”. Таксама наш герой распрацаваў унікальны мерч для “Студэнта года”:

— У 2023-м на грант Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь я рэмадэляваў астатні крою ў прадукт моды і прэзентаваў калекцыю “Прыгажунчыкі”. Яна выканана ў гэтай тэхніцы, як і ўсе мае папярэднія працы. Я прымяняю змешаныя метады канструявання, каб мінімізаваць астаткі крою і выкарыстаць кожны лапік тканіны і кожную нітачку. Сярод праектаў, якімі я ганаруся, таксама мае майстар-класы ў Новасібірску, Віцебску, Мінску ў рамках розных мерапрыемстваў.

ПРЫСВЕЧАНА БАБУЛІ ЯНЕ

У снежні мінулага года за ўпартую працу і крэатыў студэнт ВДТУ быў адзначаны прэміяй спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі:

— Для мяне гэта вельмі важная падзея. Цяпер я выразна адчуваю, што магу паўплываць на індустрыю моды ў роднай краіне. У нас на высокім узроўні развіта лёгкая прамысловасць. Лічу, што гэта ўсё трэба папулярызаваць. З удалых прыкладаў: Першы нацыянальны гандлёвы дом — крутая пляцоўка, дзе ў адным месцы можна знайсці любы айчынны прадукт. У Беларусі ствараюць моду свядома, імкнуцца ўжываць сваю сыравіну.

У будучыні Мікіта Захарчук планае выкладаць у родным ВДТУ і радаваць нас новымі калекцыямі. А яшчэ — даказваць на ўласным прыкладзе: звычайны хлопец, які вырас у Пінску ў сям’і эканаміста і інжынера, можа спраўдзіць вялікую дзіцячую мару — стаць вядомым дызайнерам:

— Лічу, што людзі, якія атрымліваюць спецыяльную прэмію Прэзідэнта, павінны дзяліцца ведамі і ўменнямі з іншымі. Таму я рады: мой выбар — выкладаць — паспрыяе працвітанню Беларусі. Цяпер я ствараю новую калекцыю “Яна”, якая будзе маім дыпломам і конкурснай працай на “Млыне моды — 2024”. Работа прысвечана тым жанчынам, якія суправаджалі і падтрымлівалі мяне на працягу жыцця. У першую чаргу гэта гісторыя пра маю бабулю Яніну, на вобразе якой я пабудаваў асацыятыўны шэраг. Вы ўбачыце адзенне для моцных і таленавітых беларусак. Скажу па сакрэце: першы выраб ужо гатовы.

Настасся ЮРКЕВІЧ
Фота з архіва героя

Калекцыя Sweet look

Калекцыя Sweet look

Калекцыя “Герлы”

Калекцыя “Прыгажунчыкі”

Свята для публікі

Марыя Сюльгіна з нумарам "Паветраная гімнастка на рамянях"

Напярэдадні 65-годдзя Белдзяржцырк прэзентаваў сумесную з расіянамі праграму "Магія фантанаў". Падчас шоу патокі вады паднімаюцца да 18 метраў і ледзь не дастаюць да купала. Ад якіх нумароў у гледача зойме дух і як установа плануе адсвяткаваць юбілей, даведалася "К".

ДОЎГАЧАКАНАЕ ВЯРТАННЕ

У Мінск расійская трупа прыехала ў другі раз, таму ў аўтараў пастаноўкі была цяжкая задача — зноў здзівіць публіку. Патокі вады суправаджаюць артыстаў у кожным выступленні. Гэтае шоу ўжо пакарыла Баку, Рыгу, Тбілісі, Будапешт і па шматлікіх просьбах аматараў цыркавога мастацтва вярнулася ў сталіцу Беларусі, каб уразіць свежымі нумарамі, абноўленай тэхнічнай часткай і незвычайнымі спецэфектамі:

Гімнастка Альдана Абдулаева з абручамі на шары

— Захацелася паказаць нешта новае. У гісторыі савецкага цырка былі прадстаўленні з фантанамі, але вада і выступленні не аб'ядноўваліся. Гэта значыць, артысты працавалі асобна, а потым пачыналі біць крыніцы. Наш праект кардынальна адрозніваецца ад іншых тым, што трукі выконваюцца паралельна з работай фантанаў. Мы стварылі канструкцыю, якая дазваляе задзейнічаць ваду і на манежы, і пад купалам, — каментуе **Наталля Беражко**, кіраўнік праграмы "Магія фантанаў".

НІКОЛІ ТАКОГА НЕ БАЧЫЛІ

Цягам шоу артысты пакажуць нумары паводле заяўленай тэматыкі. Спачатку на арэне ў акварыуме з'явіцца эквілібрыстка Аліса Удалова ў вобразе русалкі. Падхопяць "водны" настрой паветраныя гімнасты Яўген Пісараў і Марыя Сюльгіна, якія падчас дажджу ўзляцяць да купала цырка пад парасонам. Акрабаты на батуце пад кіраўніцтвам Аляксея Казлова выкарыстаюць у якасці дэкарацыі сапраўдны карабель, які лунае над залай.

Заінтрыгуе кранальным перформансам дуэт паветраных акрабатаў на рамцы: Марыя Болдырава выконвае вельмі складаныя трукі ў палёце пры дапамозе Руслана Семянцова, які падкідвае напарніцу. Па словах артыстаў, распавесці гэтую рамантычную гісторыю ўдаецца толькі дзякуючы штодзённай рабоце.

— Ужо 30 гадоў я працую на арэне. Пачала з падкідных дошак, затым спрабавала сябе ў вялікім палёце над сеткай, а калі знайшла партнёра, стала выступаць з нумарам "Паветраныя рамкі". Я люблю сваю справу і паважаю гледачоў. Мне хочацца, каб пасля шоу яны захоплена сказалі: "Мы ніколі такога не бачылі", — распавядае **Марыя Болдырава**.

Руслан Семянцоў дзеліцца сваёй гісторыяй:

— Я прыйшоў у цырк у 27 гадоў і не меў прафесійнай падрыхтоўкі. Аднойчы ўбачыў усім вядомы Cirque du Soleil і вырашыў кардынальна змяніць жыццё. У нашай справе самае важнае — не расслабляцца. Нумар доўжыцца 5-6 хвілін, і ты павінен думаць толькі пра выкананне, каб пазбегнуць падзенняў і траўмаў.

Публіку парадуюць таксама выступленні з малпачкамі, папугаямі і мядзведзямі. Але сапраўдныя каралі шоу — вялікія марскія львы. Дрэсіроўшчык Аляксандр Хлыстоў пачаў працаваць з гэтымі жывёламі, калі яны былі зусім маленькімі. Цяпер марскія львы выраслі і з'ядаюць па 15 кілаграмаў рыбы на дзень. Сакрэт паспяховага нумара — партнёрства, бо чалавеку няма сэнсу мераца сілай з такімі масіўнымі істотамі.

УТАЙМАВАЦЬ 150 ТОН ВАДЫ

Для эфекту "ваў" камандзе Белдзяржцырка прыйшлося ўтаймаваць 150 тон вады, выкарыстаных у прадстаўленні. Дзякуючы помпам і фільтрам яна пастаянна цыркулюе. А незвычайны подыум-трансформер за некалькі хвілін з басейна ператвараецца ў манеж:

— Гэтае шоу — адно з самых тэхнічна складаных у СНД. Мантаж канструкцыі доўжыўся пяць дзён. Важна прадумаць усё да дробязей, каб вада не трапляла ў рухавікі. Апошнія паўтара тыдня перад шоу артысты трэніраваліся да ночы, таму што праца на манежы з вадой спецыфічная, усё трэба адрэпіраваць літаральна да долі секунды. На арэну выходзяць не пакрасавацца, а прадэманстраваць майстэрства, — падкрэслівае тэхнічны кіраўнік праграмы "Магія фантанаў" **Юрый Базанаў**.

Ілюзія, чараўніцтва святла і тоны вады — стваральнікі шоу абяцаюць уразіць кожнага, хто прыйдзе на новую праграму Белдзяржцырка. Парасоны браць неабавязкова: па словах пастаноўшчыкаў, усё спраектавана такім чынам, што невялікія кроплі даляцяць толькі да шчасліўчыкаў у першых радах.

Настасся ЮРКЕВІЧ
Фота Ульяны КАСЦЮНІНАЙ

Віншуем!

Уладзімір Шабан, дырэктар Белдзяржцырка:

— Усё пачалося 11 лютага 1959-га, калі публіка ўбачыла першую беларускую цыркавую праграму. Мы мяркуем святкаваць юбілей установы на працягу года. Натуральна, у гэтую нядзелю будзем ладзіць шоу, прымаць пісьмовыя і электронныя віншаванні. У сярэдзіне сакавіка плануем паклікаць на невялікую ўрачыстасць сяброў, спонсараў і ветэранаў. Потым разлічваем правесці III Міжнародны фестываль цыркавога мастацтва. Планы ўжо зацверджаны, запрашэнні артыстам адпраўлены. Спадзяёмся, што прыедуць госці з усяго свету, многія ўжо пацвердзілі ўдзел. Напярэдадні фестывалю прэзентуем уласнае шоу, якое стане грандыёзным заключным этапам святкавання нашага 65-годдзя. Хачу адзначыць, што Белдзяржцырк заўсёды імкнецца здзіўляць і кожны раз стварае больш моцныя праграмы. За 11 гадоў маёй працы нам у касу ні разу не вярнулі квіток. А гэта пра многае кажа. Жадаю сваёй камандзе і спецыялістам, якія прыйдуць пасля нас, высока трымаць планку, бо Белдзяржцырк — айчынны брэнд!

Вітаўтас Грыгалюнас, мастацкі кіраўнік Белдзяржцырка:

— Нашаму любімаму цырку спаўняецца 65 гадоў! Хачу ўсіх павіншаваць з тым, што маем такое месца, куды прыходзім, як на свята. Няхай Белдзяржцырк квітнее і расце далей. Мы глядзім у будучыню з аптымізмам. Наш калектыў гатовы здзіўляць вас!

Новы погляд на мастацтва

Шэрагам яркіх вернісажаў адзначаны гэты час для студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Адразу на некалькіх пляцоўках сталіцы прэзентавалі творчасць навучэнцаў вядучай установы адукацыі ў сферы культуры. Чым уразілі маладыя аўтары — у аглядзе "К".

ПРЫВІТАННЕ З ПАДНЯБЕСНАЙ

Работы замежных студэнтаў дэманструюцца на выставе ў галерэі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Перад публікай паўстае ўсё багацце відаў і тэхнік візуальнай творчасці. Безумоўна, айчыннаму гледачу будзе цікава ўбачыць, як іншаземцы адлюстроўваюць у эцюдах ды карцінах нашы родныя краявіды — і шумныя сталічныя вуліцы, і амаль бязлюдныя зацішныя мясціны. Хоць некаторыя ўдзельнікі экспазіцыі яшчэ далёкія ад тэхнічнай дасканаласці, у кожным творы заўважныя здольнасць аўтараў адчуваць натуру, шчырае памкненне перадаць харство наваколля.

Але ж найбольшай увагі заслугоўвае набытак, які прэзентаваў Чжан Цзын — урадженец кітайскай правінцыі Хэнань. Малады чалавек, атрымаўшы ступень бакалаўра ў Цзындэчжэнскім керамічным універсітэце, паступіў у магістратуру па мастацтвазнаўстве ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў і паспяхова прайшоў гэты этап. Цяпер Чжан Цзын — аспірант гэтай жа установы.

Яшчэ ў часы навучання ў кітайскім універсітэце аўтар зацікавіўся керамікай, нават заснаваў уласную студыю ды зарэгістраваў брэнд. У Мінску творца не пакінуў захапленне і ажыццявіў праект "Добрыя зычэнні з Цзындэчжэня", у якім знаёміць беларускага гледача з разнастайнасцю ўсходняга фарфору. Выкарыстоўваючы характэрныя для сваёй радзімы прыёмы роспісу, Чжан Цзын звяртаецца да ўлюбёных матываў кітайскага дэкору — выяў кветак і птушак.

Традыцыйна ім надаецца важкае сімвалічнае значэнне. Кожная кампазіцыя заключае добрае зычэнне ці віншаванне для пэўнай жыццёвай сітуацыі. Прыкладам, адзін з самых папулярных матываў — півоні і матылькі — чытаецца як пажаданне багацця, росквіту і шчасця. Выява ж двух кітайскіх драздоў на кветкавай галінцы абазначае сямейны дабрабыт. Мужу і жонцы праз такую кампазіцыю зазвычай зычаць доўгага сумеснага жыцця ў згодзе. Паказвае мастак і дэкаратыўную талерку з арнаментам, які змяшчае кветкі лотаса. Ён займае асаблівае месца ў кітайскай культуры. Гэтая расліна ўвасабляе чысціню, беззаганнасць і духоўнасць. А ўзор з перапляценнем сцяблін, лістоў і кветак лотаса нясе зарад на доўгае жыццё.

Акрамя таго, малады аўтар прэзентуе серыю вырабаў, аздобленых кветкай, што лічыцца сімвалам нашай краіны. У работах цыкла "Сіняя валошка" творца перадае цёплыя пачуцці да Беларусі, выказвае пашану да сяброўскага народа. Выдатным прыкладам культурнага дыялогу можна лічыць тое, што Чжан Цзын малюе наш "цвяток радзімы" ў традыцыйнай кітайскай тэхніцы сіньцай. Майстры імператарскіх фарфоравых майстэрняў распрацавалі яе на мяжы XIX і XX стагоддзяў.

ГРАФІЧНАЕ ТРЫА

У рамках праекта па падтрымцы маладых талентаў галерэя Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці чарговы раз зладзіла выставу мастакоў-пачаткоўцаў. Часовая экспазіцыя "Арт-шлях" аб'яднала работы трох студэнтак Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — Валеры Вілкінай, Кацярыны Яфрэмавай і Ангеліны Сухарукавай. Яны прадставілі на суд публікі творы друкаванай графікі апошніх гадоў. Агулам паказана каля 40 аркушаў у тэхніках лінагравюры, літаграфіі, дрэварыту, а таксама рысункаў тушшу. Тэматычны дыяпазон прац даволі шырокі.

Кацярына Яфрэмава знаходзіць натхненне ў архітэктуры. Дыялог аўтаркі з рознымі ўзорамі дойлідства выліўся ў шэраг літаграфій. Таямніча-змрочную прыцягальнасць закінутых будынкаў мастачка перадала ў серыі "Забыццё". А ў аркушах "Пачатак" і "Дом, у якім..." Кацярына дазваляе сабе пэўную гульню: разбірае камяніцы на фрагменты, спалучае іх з прыродным асяроддзем, абстракцыямі і такім чынам нібыта піша ўласную версію гісторыі архітэктурных аб'ектаў. У творчасці Ангеліны Сухарукавай і Валеры Вілкінай значнае месца займае вобраз дрэва. Яны нібыта вядуць гледача ад сузірання "зморшчынак" кары і мудрагелістых крон-выцінанак да філасофскага роздуму аб часе і свабодзе.

Як падаецца, дзяўчаты пераканаўча давялі: яны паспелі набыць даволі трывалы прафесійны падмурак, які абяцае паспяховую кар'еру. Акрамя таго, студэнткі ўзялі на сябе асветніцкую місію. Аўтаркі імкнуцца пазнаёміць шырокае кола людзей з мастацтвам графікі, паказаць актуальнасць гэтага віду творчасці і раскрыць сакрэты працоўнага працэсу. Як доказ: побач з гатовымі работамі ўдзельніцы экспазіцыі размясцілі матрыцы ды ўсялякія інструменты (напрыклад, разцы і пёры), а таксама зладзілі майстар-клас па лінагравюры.

ПРЫСВЯЧЭННЕ МЭТРУ

Выстава "Амаж Леаніду Шчамялёву" адкрылася ў сталічнай галерэі класіка да 101-й гадавіны з яго дня нараджэння. Гэта знак пашаны ад маладых творцаў — студэнтак кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і касцюма Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Менавіта павага да славутага жывапісца і ўдзячнасць яму паслужылі пунктам адліку для праекта.

Гледачы сталі сведкамі своеасаблівага дыялогу пакаленняў. Побач са спадчынай Леаніда Шчамялёва экспануюцца работы, у якіх моладзь паспрабавала пераасэнсаваць набыткі мэтра. Увазе наведвальнікаў прадстаўлены габелены ў класічнай тэхніцы ручнога ткацтва, калекцыі арнаментальных кампазіцый для інтэр'ерных і касцюмных тканін у тэхніцы лічбавай графікі. Для стварэння гэтых дываноў і ўзораў студэнткі прааналізавалі кампазіцыйныя і каларыстычныя рашэнні, распрацавалі эскізы. Што атрымалася ў выніку праектных пошукаў і спроб, можна ўбачыць на ўласныя вочы да 10 сакавіка.

Даніл ШЭЙКА
Фота аўтара і ўстаноў культуры

Аўтар работ — Чжан Цзын

Шчасце творчасці — невымернае

Віцебская абласная філармонія ладзіць вечарыну “Сто гадзін шчасця”, прысвечаную 15-годдзю творчай дзейнасці сваёй салісткі, лаўрэата міжнароднага конкурсу Алены Паўлянковай. Насамрэч канцэрт, які адбудзецца 16 лютага, з'яднае ўсіх салістаў філармоніі, і гэта добрая традыцыя.

Віцебская філармонія славіцца цікавымі праектамі і адметнымі калектывамі. У яе складзе не толькі сімфанічны аркестр, але і знакаміты ансамбль танца, музыкі і песні “Талака”, які літаральна месяц таму ўдзельнічаў у канцэрце цырымоніі ўручэння прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне”, унікальны ва ўсім свеце актэт балалаек “Віцебскія віртуозы”, што справіў летась 50-гадовы юбілей, больш за дзесяць салістаў розных кірункаў. Штогодз у снежні філармонія ладзіць Міжнародны музычны фестываль імя І. Салярцінскага (сёлета ён будзе ўжо 35-м па ліку), дзе ў праграме не толькі канцэрты, але і навуковыя чытанні, конкурс музычнай крытыкі. Сярод іншых праектаў філармоніі ёсць не толькі дзіцячыя праграмы, якіх больш як паўсотні (дарэчы, для шматдзетных сем´яў прадугледжана льгота — усяго адзін квіток на цэлую кампанію), але і цыкл для цяжарных жанчын і іх будучых нашчадкаў “Саткаць душу з нот”, што ладзіцца пры партнёрскай падтрымцы віцебскіх медыцынскіх устаноў. А канцэртна-лекцыйны праект “Ad Libitum” кожны сезон змяняе тэматыку і сёлета, да прыкладу, уключае два цыклы: “Музычныя гісторыі”, якія згадваюць знаных дзеячаў мастацтва, ды “Паэзіі і музыкі саюз”, дзе аповед пра паэтаў суправаджаецца інструментальнымі кампазіцыямі.

Добрай традыцыяй сталі і рэгулярныя вечарыны салістаў, штораз з новымі праграмамі. Для артыстаў яны становяцца і своеасаблівай справаздачай, і дадатковым прыцягненнем публікі. Для той жа Алены Паўлянковай гэта ўжо далёка не першы сольнік. Сярод ранейшых былі такія ўпадабаныя гледачамі, як “Маналог жанчыны”, “Каханне, і песня, і вясна”, “Гэта было вясной”, “Пад небам Парыжа”, “Падарожжа ў Парыж”, “Не запальваючы агню” і іншыя.

— Алена Міхайлаўна, чаму ваша юбілейная вечарына названая “Сто гадзін шчасця”? Бо таго ж творчага, сцэнічнага шчасця ў вас куды больш — 15 гадоў.

— Назву я ўзяла з аднайменнай песні Канстанціна Арбеляна на верш Веранікі Тушновай, што, вядома, прагучыць у канцэрце. Там такія словы — акурат пра маё жыццё. А падобныя солькі — гэта прафесійная і шчырая патрэба дарыць людзям эмоцыі, усё тое найлепшае, што ёсць у тваёй душы.

— Мабыць, спявалі з дзяцінства?

— Так, ужо ў музычнай школе, дзе вучылася па фартэпіяна, займалася пастаноўкай голасу, удзельнічала ў конкурсах. Канчаткова абрала спевы ў 15 гадоў, калі паступіла ў Віцебскае музычнае вучылішча імя Салярцінскага (цяпер гэта каледж). У такім юным узросце на сольны вакал не набіралі, таму спачатку я вучылася як харавік-дырыжор, а потым сумяшчала дзве спецыяльнасці. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, потым магістратуру Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава, выкладала там на кафедры харавога дырыжыравання і вакалу. А 15 гадоў таму Аксана Новікава, з якой мы сябруем, прапанавала перайсці ў Віцебскую філармонію, дзе яна была саліткай і працуе дагэтуль. Я не надта хацела ісці на тое праслухоўванне, бо выкладаць мне падабалася. Але яна была настойлівай, і... так я стала салісткай: як кажуць, ад лёсу не ўцячэш. Так што 15-гадовы юбілей у мяне не ўсёй маёй дзейнасці, а менавіта сцэнічнай. Некаторы час я яшчэ сумяшчала спевы з выкладаннем, але канцэрты зацягваюць: калі ўжо падхапіў “сцэнічную хваробу”, дык яна ад цябе не адчэпіцца. Мне вельмі пашанцавала з выкладчыцай вакалу: гэта Ларыса Рабцава, я з ёй і цяпер раюся. Яна прывіла мне культуру гуку, само стаўленне да спеваў як да высокага мастацтва.

— Але ж у вашым рэпертуары не толькі акадэмічная класіка?

— Часцей красовер, дзе класіка спалучаецца з эстрадай. Такім будзе і цяперашні канцэрт, дзе па традыцыі прымуць удзел усе мае калегі. Я шчаслівая, што ў мяне ўсё склалася і на сцэне, і ў калектыве.

Зараз у Віцебскую філармонію прыйшло шмат моладзі, усе запаленыя цікавымі ідэямі, творчае жыццё віруе. Ці ж гэта не шчасце?

Вы маеце рацыю: яго немагчыма вымераць у тых ці іншых часавых адзінках, бо яно — невымернае. Шчасце — дзяліцца з публікай тым найлепшым у мастацтве, што назапасілі і збераглі. І што ўзрасце, калі ім падзелішся. Бо культура і мастацтва — тыя вечныя каштоўнасці, якія даюць нам сілы ў жыцці.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва філармоніі

Адзін з праектаў філармоніі — калядны канцэрт, 2023

Сустрэча з начальнікам крымінальнага вышуку Дзмітрыем Юрчыкам

Цікава тут у вас!

“Што мы можам зрабіць, каб бібліятэка была прывабнай для моладзі?” — Таццяна Маляўка пачала ліст з пытання. Праблема зачапіла — і мы паглыбіліся ў аповед загадчыцы аддзела Ганцавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя В. Ф. Праскурава.

“Трэба шукаць новыя дынамічныя формы працы, напаўняючы іх зместам, адпаведным духу часу”, — упэўнена Таццяна Уладзіміраўна. На прыкладах адмысловец тлумачыць эфектыўныя падыходы, знойдзеныя ў яе ўстанове.

— Наша бібліятэка — пляцоўка для камунікацыі маладых людзей, абмену думкамі і ідэямі, узаемадзеяння адзін з адным і з грамадствам. Колькасць наведвальнікаў ад 15 гадоў да 31 складае 30 % ад усіх карыстальнікаў. У асноўным гэта навучэнцы, студэнты, маладыя спецыялісты, рабочыя і служачыя. Зразумела, бібліятэка — далёка не адзіная ўстанова, якая арганізуе іх вольны час. Ёсць кафэ, кінатэатры, клубы, дзе збіраюцца аднагодкі і аднадумцы. Каб сапернічаць з такімі канкурэнтамі, кніжная скарбніца павінна аказваць інтэграваныя паслугі — не толькі інфармацыйныя, але і тыя, што паглыбляюць у культуру і творчасць. Рабіць гэта трэба планава, паслядоўна, дальнабачна. Таму ў працы з новым пакаленнем галоўны арыенцір — праектная дзейнасць.

У 2021—2023 гадах Ганцавіцкай ЦРБ імя В. Ф. Праскурава запушчаны праекты для моладзі “Бібліятэка ў стылі ART «СтеАктыўныя!»” (разлічаны на тры гады), “Літаратурна-краязнаўчы чэлендж” і “Як я стаў сабою” (на два). Для іх рэалізацыі работнікі кніжнай скарбніцы забяспечылі ўмовы, якія спрыяюць арганізацыі культурнага вольнага часу юнакоў і дзяўчат, раскрыццю іх патэнцыялу, скаардынавалі дзейнасць з установамі, што працуюць з гэтай катэгорыяй насельніцтва.

ДОБРАЯ АСНОВА

Базай для праектаў выбралі найбуйнейшае структурнае падраздзяленне Ганцавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, фонд якога складае 48 тысяч экзэмпляраў. Цэнтральная раённая бібліятэка штогод абслугоўвае больш за 3 тысячы карыстальнікаў, што атрымліваюць каля 45 тысяч выданняў. Для наведвальнікаў усталяваны камп'ютары і створаны публічныя цэнтры прававой інфармацыі. Перавага ўстановы і ў тым, што яна размешчана ў сэрцы горада — ёсць магчымасць праводзіць мерапрыемствы для вялікай аўдыторыі. У зоне абслугоўвання — тры агульнаадукацыйныя школы, гімназія, сельскагаспадарчы ліцэй, дапаможная школа-інтэрнат, шэраг прадпрыемстваў і арганізацый. Да таго ж у кніжнай скарбніцы працягваюцца паспяховыя праекты, якія датычацца здаровага ладу жыцця, экалагічнага, патрыятычнага выхавання.

У ЦРБ імя В. Ф. Праскурава камфортныя абстаноўка і інфармацыйнае асяроддзе, што спрыяюць самарэалізацыі новага пакалення, развіццю яго творчых здольнасцей. Вопытныя адмыслоўцы — яркія, камунікабельныя, умеюць працаваць з юнай аўдыторыяй. Бібліятэчная моладзь — мабільная, хутка падхоплівае інавацыйныя, крэатыўныя ідэі і паспяхова іх увасабляе.

ЯК ГЭТА ДЗЕЙНІЧАЕ

Падчас рэалізацыі праекта “Бібліятэка ў стылі ART «СтеАктыўныя!»” былі выяўлены юнакі і дзяўчаты з багатым творчым патэнцыялам. Для іх кніжная скарбніца стала месцам набыцця новых уражанняў, ведаў, уменняў. Так, у межах ініцыятывы арганізавалі “Галерэю юных мастакоў”, у якой зладжана больш за 15 экспазіцый. На прэзентацыях прысутнічалі равесніку аўтараў карцін. Арт-праект перамог на абласным конкурсе “Бібліятэка для моладзі — бібліятэка магчымасцей” у намінацыі “Развіццё”, прысвечанай тэме ўсебаковага раскрыцця здольнасцей хлопцаў і дзяўчат, іх далучэнню да розных формаў інтэлектуальнага адпачынку, культурнага і духоўна-маральнага развіцця.

У працы з новым пакаленнем бібліятэка надае асаблівую ўвагу патрыятычнаму выхаванню — назапашаны багаты вопыт. Знаёмства моладзі з кнігай “Генацыд беларускага народа”, прэзентацыя выставы “Ахвяры генацыду — памяць народная”, сустрэчы з пракурорам раёна Аляксандрам Гурбановічам — гэта толькі пачатак спіса праведзеных мерапрыемстваў. Навучэнцаў не пакінулі абыякавымі гістарычна-патрыятычныя гадзіны “Памяць і боль беларускай зямлі”, “Калі мы адзіныя, мы непераможныя”, “Рэха Афганскай вайны”, “Хатынь: памяць і трагедыя”. Зацікавілі юную аўдыторыю прававыя ўрокі “Што мы ведаем пра Канстытуцыю?”, “Ведай правы, не забывай і пра абавязкі”, краязнаўчыя ўрокі “Пісьменнікі роднага краю”, “Усяму пачатак тут...”.

Прыцягнуў увагу моладзі і “Літаратурна-краязнаўчы чэлендж”, разлічаны на карыстальнікаў сацыяльных сетак. Яго мэта — папулярызаваць творчасць літаратараў-земляко ў. Гэты праект быў прадстаўлены ў 2022 годзе на XXX Рэспубліканскім конкурсе “Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры”, на якім ЦРБ імя В. Ф. Праскурава ўзяла прызавое месца ў намінацыі “За падтрымку і развіццё чытання”.

НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

А летась рупліўцы вырашылі ўзняць на якасна новы ўзровень, напоўніўшы практычным зместам, традыцыйную працу па патрыятычным выхаванні моладзі і развіцці яе грамадзянскай свядомасці. Так, стартаваў грамадзянска-патрыятычны праект “Як я стаў сабою”. Каардынатарам і распрацоўшчыкам выступіў аддзел бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай ЦРБ імя В. Ф. Праскурава, які ўзначальвае Таццяна Маляўка. Адмыслоўцы ўзяліся за ўдасканаленне і развіццё сістэмы, што забяспечвае мэтанакіраванае фарміраванне ў моладзі высокай сацыяльнай актыўнасці, патрыятызму, пачуцця гонару за Айчыну, гатоўнасці да выканання грамадзянскага і канстытуцыйных абавязкаў. Работнікі аддзела ўжо правялі больш за два дзясяткі сустрэч з паспяховымі і аўтарытэтнымі прадстаўнікамі розных прафесій. Арганізоўваюцца мерапрыемствы, на якіх новае пакаленне знаёміцца з землякамі-сучаснікамі, чые ўчынкі, ідэалы і погляды могуць стаць прыкладам, матывацыяй.

— Пасля адной з падобных сустрэч старшакласніца сказала: “Цікава тут у вас! Ніколі б не падумала, што побач жывуць людзі з такой неверагоднай энергетыкай, захапляльнымі лёсамі і вялікім сэрцам, — распавядае Таццяна Уладзіміраўна і сціпла дадае: — Вось у гэтым простым прызнанні і ёсць наш плён. Бібліятэка, стварэнне ўмоў для ўсіх, хто ў ёй, — гэта і ёсць наш шлях

Родная, музычная, народная

У рэспубліканскім календары культурных мерапрыемстваў Магілёўскі абласны фестываль народнай творчасці "Беларусь родная, музычная, народная" займае пачэснае месца нездарма. Падчас гэтага свята ладзяцца прэзентацыі культурнага, гістарычнага, творчага патэнцыялу ўсіх раёнаў — канцэртныя і экспазіцыйныя імпрэзы вылviваюцца ў стракаты марафон талентаў Прыдняпроўскага краю.

Чым здзівіў гледачоў самы ўсходні куток Беларусі? Зазірнём на прэзентацыю Хоцімшчыны — чатырнаццатага ўдзельніка фестывалю.

Традыцыйна ў фае Магілёўскага цэнтра народнай творчасці разгарнулася выстава. Па словах дырэктара Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Хоцімскага раёна Валерыя Жадана, прывезлі найлепшае: ад самых яркіх калектываў да самай смачнай выпечкі.

— Па вырабы нашага хлебазавода прыязджаюць нават з Расіі, — расказвае Валерый Сяргеевіч. — Таксама шырока прадстаўлены раённы Дом рамёстваў: саломапляценне, ткацтва, кераміка, тэкстыльныя лялькі. Мы ганарымся сваімі адмыслоўцамі, тры з якіх маюць статус "народны майстар".

Адна з іх — Таццяна Кавалёва — сустракае гасцей за старажытным ткацкім станком.

— Пояс даўжынёй пяць метраў я саткала на свяце "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў"). Ёсць і ручнікі. Вось з арнаментам, які сімвалізуе поле, сонца, ураджай, дабрабыт, — распавядае Таццяна Іванаўна. — На стварэнне такога патрэбна каля двух тыдняў. Самы доўгі я рабіла два месяцы. Ён увесь ва ўзорах, таму заняў шмат часу. У мяне тры вучаніцы за 50 гадоў, ды хочацца, каб прыходзіла і моладзь, каб беларускае ткацтва жыло і квітнела.

Вырабы Людмілы Кавалёвай чапляюць яркім колерам. У яе калекцыі — дэкаратыўныя пано, элементы інтэр'еру і незвычайныя сувеніры.

— Мяне вабіць саломка. Гэта ўнікальны матэрыял, вельмі цёплы і прыгожы, — расказвае Людміла Дзянісаўна. — А яркажоўтага адцення дамагаюся, папярэдне замочваючы саломку ў содзе, вось і атрымліваецца сонечны колер.

Трэці народны майстар Ніна Рагоўская прывезла ў Магілёў керамічныя збаны, талеркі, сувеніры, упрыгожанні. Галоўная іх асаблівасць — ангобны роспіс.

— Гэта від роспісу белай глінай па яшчэ сырым чарапку, — тлумачыць Ніна Сямёнаўна. — Мне падабаецца адраджаць традыцыю і паказваць гэтае багатае мастацтва.

Усяго ж у складзе дэлегацыі амаль 100 чалавек. На фестываль прыбылі і работнікі раённай бібліятэкі: прывезлі экспазіцыю, прысвечаную развіццю краю. Унікальныя экспанаты даставілі супрацоўнікі Хоцімскага гісторыка-краязнаўчага музея. Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі "Ветразь надзей" прадэманстраваў тэматычныя касцюмы, фотамастак Аляксандр Каржоў — здымкі, якія адлюстроўваюць прыгажосць роднай зямлі.

— Выстава атрымалася насычанай і цікавай, — распавяла Крысціна Башарымава, вядучы рэдактар УК "Магілёўскі абласны метадычны цэнтр НТ і КАР". — Не менш яскрава прадставілі сваю творчасць і калектывы. Народныя песні, танцы, музычныя кампазіцыі ўвасобілі гісторыю раёна. Артыстам апладзіравалі і госці, і гаспадары фестывалю народнай творчасці "Беларусь родная, музычная, народная", які будзе праходзіць у Магілёве на працягу года. Фіналам стане гала-канцэрт, куды ўвойдуць найлепшыя канцэртныя праграмы.

Людміла Кавалёва

Ніна Рагоўская

Таццяна Кавалёва

Люты ў падзеі абуты!

10.02

Культурны каляндар адкрывае **Свята юшкі "Морынская залатая рыбка"** на Гродзеншчыне. У праграме — канцэрты, гульні, конкурсы і спаборніцтвы па гатаванні юшкі. Удзельнікі прэзентуюць сваю страву і падзеляцца сакрэтамі рэцэптаў, а журы ацэніць не толькі смакавыя якасці, але і арыгінальнасць афармлення пляцоўкі.

15.02

Абрад "Стрэчанне", ці "Грамніцы", пройдзе 15 лютага ў вёсцы Новае Палессе Гомельскай вобласці. Штогод на праваслаўнае свята адбываецца ўрачысты абход паселішча: гучаць абрадныя песні, дабраславенні, пажаданні здароўя, дабрабыту і міру.

19.02—29.02

XIX Форум маладых кампазітараў Беларусі і краін СНД імя М.К. Агінскага правядуць з 19 па 29 лютага. У Маладзечне разгорнецца шырокая праграма — адукацыйныя лекцыйныя цыклы для маладых кампазітараў і музыказнаўцаў, майстар-класы, практычныя заняткі па фарміраванні навыкаў работы з сімфанічным аркестрам у працэсе напісання музычных твораў. Яркімі падзеямі стануць канцэртныя выступленні з творамі маладых кампазітараў папярэдніх форумаў і прэзентацыя найноўшых аўтарскіх адукацыйных праграм запрошаных майстроў фестывалю.

28.02—01.03

II Міжнародны культурна-адукацыйны праект "Форум дырыжораў" адбудзецца з 28 лютага па 1 сакавіка ў Магілёве. Мэта фестывалю — папулярызацыя і развіццё аркестравага выканальніцтва і ўзбагачэнне нацыянальнай школы дырыжорскага майстэрства перадавым міжнародным вопытам. Праграма ўключае семінар-практыкум, круглы стол і майстар-класы. У рамках праекта пройдзе анлайн-конкурс аркестраў народных інструментаў імя Леаніда Іванова, а таксама гранд-канцэрт дырыжораў з удзелам больш чым 20 прадстаўнікоў Беларусі і Расіі.

НА ЛЮТЫ ЗАПЛАНАВАНА ШМАТ ІНШЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ. ПАДРАБЯЗНАСЦІ — НА САЙЦЕ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Рэцэпт "Любоўнага напою"

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі крэатыўна працуе з публікай: запрашае яе на спектаклі, канцэрты, "старановагоднія" балі, фестывалі, выставы ды іншыя праекты, што прыадчыняюць дзверы ў закулісе. Ды гэта не толькі экскурсіі!

Днямі тых, хто прыдбаў квіток на "Любоўны напой", паклікалі на... рэпетыцыю і творчую сустрэчу з галоўным рэжысёрам Ганнай Маторнай, якая паставіла гэтую оперу Даніцэці. Каб патрапіць на незвычайныя мерапрыемствы, некаторыя гледачы набывалі білеты на спектакль непасрэдна перад сустрэчай. Рэцэптура аказалася простай па інгрэдыентах: ідэя, яе бездакорнае ўвасабленне, заснаванае на напружанай працы, — і "напой", што дадаткова прыцягне публіку ды навучыць яе лепш разбірацца ў оперным жанры, гатовы.

Пасля рэпетыцыі, на якой гасцям тэатра паказалі фрагменты пастаноўкі, усіх запрасілі на сцэну для агульнага фота. А ў час творчай сустрэчы Ганна Маторная распавяла пра планы. Да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў рыхтуецца новы праект на музыку беларускіх кампазітараў — пад рабочай назвай "Татэтычны дзённік памяці". А ў канцы года прадставяць свежае прачытанне "Яўгена Анегіна".

Падобныя сустрэчы тэатр плануе працягваць. Пакуль жа — запрашае на вечар беларускай культуры 13 лютага: перад пачаткам "Сівой легенды" адкрыецца выстава традыцыйных строяў і пройдуць майстар-класы па завязванні наміткі і слуцкіх паясоў.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва тэатра

Па старонках календара

■ **12 лютага** з'явіўся на свет Вітольд Бялыніцкі-Біруля (1872—1957) — беларускі жывапісец-пейзажыст, народны мастак БССР і РСФСР. Быў членам Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў (з 1904), акадэмікам жывапісу Імператарскай Акадэміі мастацтваў, членам Саюза рускіх мастакоў, Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыйнай Расіі (з 1922), ганаровым акадэмікам Акадэміі навук БССР (1947), правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР (1947).

■ **14 лютага** нарадзіўся Віталь Цвірка (1913—1993) — беларускі жывапісец і педагог, народны мастак БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, у 1962—1963-м — старшыня Саюза мастакоў Беларусі.

■ **15 лютага** з'явілася на свет Ларыса Александроўская (1904 (1902) — 1980) — беларуская савецкая оперная спявачка, народная артыстка БССР і СССР, лаўрэат Сталінскай прэміі другой ступені. З 1933-га — салістка Вялікага тэатра Беларусі, у 1951—1960-м — адначасова і яго галоўны рэжысёр.

■ **15 лютага** 1945-га нарадзіўся Яўген Сахута — беларускі мастацтвазнаўца і этнолог, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. З'яўляецца старшынёй Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.

Яўген Міхайлавіч — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне". У 1985—1991 гадах быў галоўным рэдактарам часопіса "Мастацтва Беларусі".

■ **18 лютага** нарадзіўся Васіль Казлоў (1903—1967) — беларускі савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, Герой Савецкага Саюза (01.09.1942), генерал-маёр (1943).

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці. У ліпені 1941-га прызначаны першым сакратаром Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б. З верасня 1942-га знаходзіцца ў Маскве, працуе ў Цэнтральным штабе партызанскага руху. У ліпені 1943-га вярнуўся ў Беларусь і зноў узначаліў Мінскае партызанскае аб'яднанне, якім кіраваў да вызвалення вобласці ў ліпені 1944-га.

Афіша з 9 па 16 лютага

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20, тэл.: 8 017 3970163 (экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава **"Ачышчаецца сэрца маё, ідучы па Чыстай рацэ". Да 24 сакавіка.**
- Выстава **"Мастацкаму — 85. Афішы і фотаздымкі"**, прысвечаная юбілею Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. **Да 24 сакавіка.**
- Экспазіцыя **"Беларуская скульптура XVII—XVIII стст."**, на якой прадстаўлена больш за 80 помнікаў культавай драўлянай скульптуры і разьбы, створаных у першай палове XVII — канцы XVIII ст., з фондаў музея. Выставачны корпус, вул. Карла Маркса, 24. **Да 7 красавіка.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўнія мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а, тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- Выстава твораў мастака Тамары Турбінскай **"Настрой". Да 24 лютага.**
- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Квэст **"Пошукі мінулага"**.
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Зборная інтэрактыўная праграма **"Мова веера". Праводзіцца заўсёды.**
- Праграма **"У свяцілішчы, дзе дыхае цень алівы". Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца, вул. Іванаўская, 17б, тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава майстра па бісерапляценні Веры Уладзіміраўны Занкевіч **"Па матывах ткацтва"**. У экспазіцыі прадстаўлены ўпрыгожанні з некалькіх калекцый, распрацаваных у перыяд дзейнасці аўтара — з 2003 па 2023 год. **Да 18 лютага.**
- Выстава з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.
- Майстар-клас **"Саломапляценне". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Лялька-мотанка". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Ткацтва". Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37, тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**
- Выставачны праект **"Край белых буслоў. Вобраз Радзімы ў творах беларускіх мастакоў XX—XXI стст". Да 4 сакавіка.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Рамантычная камедыя ў 2 дзеях **"Я бяру гэтага хлопца" (16+). 9 лютага ў 18.30.**
• Музычная казка ў 1 дзеі **"Дзюймовачка" (0+). 10 лютага ў 12.00.**
• Містычная трагікамедыя ў 1 дзеі **"Старасвецкія памешчыкі" (16+). 10 лютага ў 18.30.**
• Чароўная казка **"Марозка" (0+). 11 лютага ў 12.00.**
• Prank comedy ў 2 дзеях **"Шалёныя грошы" (16+). 11 лютага ў 18.30.**
• Сучасныя вадэвілі ў 1 дзеі **"Спадары, таварышы, сволачы і дамы" (16+). 13 лютага ў 18.30.**
• Камедыя **"Рамантыкі" (12+). 14 лютага ў 18.30.**
• Драма **"Калігула" (18+). 15 лютага ў 18.30.**
• Камедыя ў 2 дзеях **"Тарцюф" (16+). 16 лютага ў 18.30.**
• Музычная казка ў 1 дзеі **"Як Кашчэй Бессмяротны з Васілісай ажаніўся" (6+). 17 лютага ў 12.00.**
• Вадэвіль у 2 дзеях **"Бяда ад пяшчотнага сэрца" (12+). 17 лютага ў 18.30.**

УНП 700184039

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+).** Галоўная сцэна. **10 лютага ў 19.00.**
• Трагікамедыя ў 2 дзеях па матывах твора У. Шэкспіра **"Рамэа і Джульета" (12+).** Галоўная сцэна. **11 лютага ў 19.00.**
• Спектакль **"А зоры тут ціхія" (12+).** Прэм'ера. Галоўная сцэна. **13 лютага ў 19.00, 18 лютага ў 19.00.**
• Рэквіем у 1 дзеі **"Вечар" (12+).** Галоўная сцэна. **14 лютага ў 19.00.**
• Камедыя ў 2 дзеях **"Паўлінка" (12+).** Галоўная сцэна. **15 лютага ў 19.00.**
• Пластычны спектакль у 1 дзеі **"Наш космас" (12+).** Галоўная сцэна. **17 лютага ў 19.00.**

УНП 100577901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Балет у 2 дзеях **"Шчаўкунок" (6+). 9 лютага ў 19.00.**
• Опера-балет у 2 дзеях **"Вілісы. Фатум" (12+). 10 лютага ў 18.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Лебядзінае возера" (12+). 11 лютага ў 18.00.**
• Канцэрт **"Джакама Пучыні. Сапраўдны геній оперы" (12+).** Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **11 лютага ў 18.30.**
• Опера ў 2 дзеях **"Сівая легенда" (16+). 13 лютага ў 19.00.**
• Балет у 3 дзеях **"Рамэа і Джульета" (12+). 14 лютага ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Чароўная флейта" (12+). 15 лютага ў 19.00.**
• **Канцэрт-прысвячэнне памяці прафесара А. Б. Янпольскага (12+).** Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **16 лютага ў 18.00.**
• Балет у 3 дзеях **"Баядэрка" (12+). 16 лютага ў 19.00, 18 лютага ў 18.00.**
• Опера ў 3 дзеях **"Тоска" (12+). 17 лютага ў 18.00.**
• Канцэрт **"Шэдэўры сусветнай оперы. Дуэты" (12+).** Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **18 лютага ў 18.30.**

УНП 191081322

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Кранальная гісторыя без слоў у 1 дзеі **"Дзюймовачка" (3+). 11 лютага ў 11.00.**
• Казка-гульня ў 2 дзеях **"Бука" (3+). 17 лютага ў 11.00.**
• Музычная казка ў 2 дзеях **"Дапытлівы Слонік" (4+). 18 лютага ў 11.00.**

УНП 300001869

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Выстава сучаснага скульптара Максіма Петруля **"4х4". Да 16 лютага.**
• Часовая экспазіцыя **"Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў. XXI стагоддзе. Санкт-Пецярбург".** Вялікая выставачная зала. **Да 10 сакавіка.**
• Часовая экспазіцыя **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны". Да 13 кастрычніка.**
• Экспазіцыя **"Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Маці ў камені".** Аўтар праекта А. Папельскі. Малая выставачная зала. **Да 18 лістапада.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара". У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **"Палацавыя таямніцы".**
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры", "Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа", "Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»".**
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Выставачны праект **"Жывапісны матыў"** сучасных мастакоў Леанілы і Дзмітрыя Трапезнікавых. **Да 8 красавіка.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)
Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX ст.".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стагоддзяў **"Культура часу".** З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне".**
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Лекцыя-візуалізацыя **"Мастацтва жывапісу ніткай". У кожную сераду і суботу лютага ў 12.00.**
• Квэст **"Белы слон". 10 лютага ў 15.30.**
• Часовая экспазіцыя **"Погляд у мінулае: мода, стыль і прыгажосць" (0+).** Прадметы побыту, мэбля, мужчынскія і жаночыя аксесуары прадстаўнікоў вышэйшых слаёў грамадства XIX — пачатку XX стагоддзя. Слановая зала. **Да 25 лютага.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка".**
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**

УНП 590201541

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл.: 8 0212 368387 (каса),
сайт: **vitebsk-fil.by**

• Юбілейны канцэрт **АЛЕНЫ ПАЎЛЯНКОВАЙ** (сапрана) з удзелам усіх салістаў філармоніі **"СТО ГАДЗІН ШЧАСЦЯ" (6+). 16 лютага ў 19.00.**
• Музычна-гульнявая праграма **"КАРАМЕЛЬКА І ГАРОШЫНКА Ў КОСМАСЕ" (3+)** у межах праекта **"ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ". 17 лютага ў 11.00.**
• Музычная казка В. Улановуўскага **"ЗАЛАТОЕ КУРАНЯ" (2+)** у межах праекта **"ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ". 18 лютага ў 11.00.**

УНП 300149385

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая выстава **"Адзінай памяці верныя"**, прысвечаная 80-годдзю з пачатку вызвалення Беларусі.
• **Урок гісторыі ў музеі** — унікальная паслуга, якая стане выдатнай альтэрнатывай класічным заняткам у школах і каледжах. Музейныя ўрокі праводзяцца па розных тэмах, уключаюць тэарэтычную і практычную часткі, што дазваляе навучэнцам больш эфектыўна авалодваць новымі ведамі. Прапанаваныя тэмы музейных урокаў:
— **"Вучыцца ў імя Перамогі"** (для вучняў I—IV класаў);
— **"Лясны карэспандэнт"** (для вучняў V—VIII класаў);
— **"Пачатак вызвалення Беларусі. Восень 1943 года"** і **"Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг."** (для вучняў IX—XI класаў).
• Адкрыццё часовай экспазіцыі **"Я памятаю гэта, як учора..."**.

Падрабязнасці на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Персанальная выстава твораў Вадзіма Качана **"Ад піктарыялізму да канцэптуалізму". Да 11 лютага.**
• Выстава **"Пераадоленне". Да 11 лютага.**
• Персанальная выстава твораў Івана Козела **"Іван Козел. Жывапіс". Да 18 лютага.**
• Выставачны праект **"Сузор'е вандроўніка". Да 18 лютага.**
• Выстава **"Моры рэальныя і выдуманыя. Беларускія літаратары на вакацыях". Да 18 лютага.**
• Выстава-прэзентацыя **"Творчыя майстэрні — спадчына М. Савіцкага"**, прымеркаваная да дня нараджэння народнага мастака БССР і СССР, Героя Беларусі Міхаіла Андрэевіча Савіцкага (1922—2010). **Да 18 лютага.**

УНП 192543414

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819**.

УНП 100377771

t.me/kultinfa

Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад "Культуры"! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзіўляйце суразмоўцаў у Telegram!

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Віктар ГАУРЫШ.

Аглядальнікі рэдакцыі — Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ілья СВІРЫН, Даніїл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Рэдактары літаратурныя — Мацвей ЗАЙЦАЎ, Лідзія НАЛІЎКА.
Рэдактар мастацкі — Мікалай КАСЦЮКОЎ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Льготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісана ў друк 08.02.2024 у 16.00. Замова № 277. Наклад 3602.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2024.